# Ад літаратуразнаўства да матэматыкі, ад гульні да сур’ёзнага

14.11.2022 09:54

Навукоўцаў, даследчыкаў і аматараў творчасці народнага пісьменніка з розных устаноў і рэгіёнаў Беларусі сабрала 36-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Каласавіны», прымеркаваная да 140-годдзя народнага песняра, якая нядаўна прайшла ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.



Валерый Грамада і Ірына Мацяс.

Пачалася канферэнцыя з урачыстасці — прывітальнага слова да гасцей мерапрыемства першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады. У фонды ўстановы быў перададзены прывітальны Адрас ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. За вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, папулярызацыю нацыянальнай культуры і заслугі ў развіцці музейнай справы калектыву ўстановы была аб’яўлена Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай. За шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі нацыянальнай культуры Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагародзілі супрацоўнікаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа — вядучага навуковага супрацоўніка Ірыну Казловіч і вучонага сакратара Марыю Казакевіч; Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь — дырэктара Ірыну Мацяс і галоўнага фондазахавальніка Васіліну Міцкевіч. Павіншаваў калег і калектыў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый Марозаў агучыў прапанову аб супрацоўніцтве з музеем у галіне фарміравання літаратурных тураў. Падчас урачыстасці выступоўца зазначыў, што аб’екты літаратурнага жыцця краіны вядомы сярод моладзі не ў той ступені, як таго хацелася б. Работа з дзецьмі і маладымі людзьмі, распрацоўка фармату новых экскурсій і тураў, што заахвочвалі б і школьнкаў, і студэнтаў да больш глыбокага знаёмства з літаратурнай спадчынай, наведванне месцаў памяці, якія сведчаць аб багацці айчыннага пісьменства — гэта тое, у чым сёння ёсць патрэба зрабіць абнаўленні, прапанаваць новыя маршруты, адаптаваныя да сённяшніх вандроўнікаў.
Адным з найцікавейшых дакладаў, зачытаных на пленарным пасяджэнні канферэнцыі, быў расповед прафесара, доктара гістарычных навук Эмануіла Іофе. На працягу многіх гадоў даследчык і культуролаг цікавіўся малавядомымі старонкамі жыцця Якуба Коласа, і вынікам гэтага стала тое, што ён захаваў унікальныя здымкі пісьменніка, зробленыя ў 1942 годзе акадэмікам Мікалаем Ярмоленкам у Ташкенце. Вучоны агучыў гісторыю сяброўства слыннага песняра з акадэмікам Уладзімірам Пічэтам, сям’ёй акадэміка Канстанціна
**Горава і некаторымі іншымі вядомымі асобамі.**
Арыгінальнасцю вылучыўся даклад кандыдата філалагічных навук, супрацоўніка філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» Анатоля Трафімчыка. Неардынарнасць даследчыцкай думкі палягала ў спробе, паводле яго слоў, «раскласці літаратуразнаўства на матэматыку». Абагульненыя даныя — вынікі параўнання некаторых параметраў, датычных аб’ёму паэмы Я. Коласа «Новая зямля» з іншымі эпічнымі творамі з гісторыі літаратуры, пачынаючы са старажытнаіндыйскага эпасу і да твораў XIX стагоддзя, ён прадставіў у выглядзе адной табліцы. Асноўны падыход, якім кіраваўся пры тлумачэнні некаторых пытанняў аб’ёму «Новай зямлі» А. Трафімчык, — дыялектыка твораў мастацтва, якая, на думку даследчыка, спарадзіла так званую сугестыю мастацкага твора. То-бок, хаця «Новая зямля» і лічыцца «энцыклапедыяй сялянскага жыцця», паэма не з’яўляецца самым вялікім па змесце творам, датычным сялянскага побыту. Але, як перакананы вучоны, у плане вычарпальнасці твор праз гэта нічога не страчвае, а толькі набывае: інакш ён не чытаўся б так лёгка, на адной хвалі.
Далей работа канферэнцыі праходзіла ў трох асобных коласазнаўчых секцыях, аб’яднаных тэматычна, дзе разглядаўся самы шырокі спектр пытанняў. Адны з іх тычыліся творчай індывідуальнасці Якуба Коласа ў рэцэпцыі розных вядомых асоб, якія глыбока пераасэнсоўвалі постаць слыннага песняра, а таксама ў адлюстраванні на старонках перыядычных выданняў — айчынных і замежных. Іншыя даследчыкі ўздымалі пытанні адметнасцей успрымання і перакладу твораў Я. Коласа.

Некаторыя звярнуліся да дзейнасці паэта як перастваральніка на родную мову твораў сусветнай літаратуры. Шэраг выступоўцаў распавядалі пра дакументы сям'і народнага пісьменніка, невядомыя шырокай аўдыторыі.



З дакладам выступае Васіліна Міцкевіч.

Калі з літаратурнай спадчынай песняра ў той ці іншай ступені знаёмыя ўсе, то пра яркую пасіянарную пазіцыю, актыўную грамадскую дзейнасць Якуба Коласа — як ён дамагаўся адкрыцця школ, паляпшэння ўмоў жыцця дзяцей-сірот, у гады вайны дапамагаў эвакуіраванаму насельніцтву ў самых розных пытаннях; колькім суайчыннікам ён дапамог грашыма, простай чалавечай падтрымкай, добрым словам — ведаюць нямногія. Між тым гэта — адзін з маладаследаваных бакоў постаці Якуба Коласа. Так, гісторыю пабудовы школы ў Мікалаеўшчыне агучыла ў дакладзе доктар філалагічных навук, прафесар філіяла «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры На¬цыянальнай акадэміі навук Беларусі» Валянціна Мароз. Адметна тое, што даследчыца была выпускніцай гэтай знакамітай школы, пабудаванай у 1948 годзе дзякуючы намаганням Якуба Коласа. А да таго часу дзеці вучыліся па хатах. Яны вымушаны былі ісці на заняткі з бярэмем дроў у хадодную пару года — такой была надзённая патрэба тых няпростых часоў. Пісьменнік штурмаваў органы ўлады лістамі, кантраляваў розныя моманты будаўніцтва школы, узяў на сябе клопат набыцця літа¬ратуры для вучобы, вырашаў пэўныя праблемы, звязаныя з фінансаваннем. А колькі звярталася да яго простых вяскоўцаў! Людзі былі ўпэўнены, што ён не пакіне іх сам-насам з бедамі...

Пра дзейнасць Якуба Коласа ў якасці народнага дэпутата распавяла загадчык навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея песняра Вольга Наважылава. На працягу года музейшчыкі збіралі звесткі па гэтай тэме. Так, сярод задач, якія вырашаў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, было пасляваеннае аднаўленне гарадоў і асвятленне вуліц, рамонт дарог і ашчаднае выкарыстанне электрычнасці, вяртанне ў Беларусь інтэліген¬цыі і высокакваліфікаваных работнікаў... Сярод іншых пытанняў у межах канферэнцыі немалаважнай стала і дыскусія аб тым, як зрабіць асобу народнага пісьменніка больш блізкай, зразумелай цяперашнім навучэнцам. Адным з самых крэатыўных спосабаў злучыць мінулае з сучасным у папулярызацыі беларускага класіка можна лічыць прыдумку Івана Дубовіка. Вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа распраца¬ваў своеасаблівую гульню, скіраваную на прыцягненне ўвагі дзяцей да асобы песняра і яе вывучэння. Галоўнае ў літаратурным квэсце — выйсці з пэўнага часавага лабірынта, куды трапляе ўдзельнік праз верш Якуба Коласа. У дакладзе пад назвай ««Пятля часу» ў Сёмкаве: вопыт эксплуатацыі» даследчык распавёў пра тое, як прынялі яго вынаходніцтва юныя сучаснікі.



Фрагмент экспазіцыі.

Адметнымі звесткамі, асаблівым пераасэнсаваннем рэалій, у якіх жыў і твараў Якуб Колас, арыгінальнас¬цю падыходаў парадавалі даклады кандыдата філалагічных навук, супрацоўніка Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктара Жыбуля, галоўнага захавальніка фондаў

Дзяржаўнага літаратурнамемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліны Міцкевіч, кандыдата філалагічных навук, дацэнта, дактаранта філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдата філалагічных навук, дацэнта Міколы Труса, супрацоўніцы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Настассі Трафімчык і іншыя.

**У сэрцы кожнага**

Каб лепей адчуць атмасферу, у якой праходзілі «Каласавіны», прапануем паглядзець на падзею вачыма адной з яе ўдзельніц, Валерыі Філіпенкі, старшага выкладчыка кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы БДУКМ:

«У «Каласавінах» вырашыла прыняць удзел упершыню — атрымалася, што якраз да юбілею. Прыехала я з даследаваннем «Дэтэрмінанта творчасці асобы ў творах Якуба Коласа». Нягледзячы на тое, што тэма гэтая культуралагічная, яна будзе цікава і аматарам творчасці песняра, і навукоўцам, у кола інтарэсаў якіх уваходзіць пытанне відаў творчасці ў сучаснай сацыякультурнай прасторы, матываў, якія натхняюць пэўнага творцу на розныя віды творчасці, і для культуролагаў, якія займаюцца дэтэрмінацыяй таго ці іншага творчага акта. Ад іншых удзельнікаў канферэнцыі хацелася б пачуць, хто ёсць Колас для кожнага з іх, які след ён пакінуў для іх як навукоўца і якія перспектывы мы бачым для яго як паэта зямлі беларускай. Гаворачы словамі Шпенглера, калі культура — жывая вада, то мова Я. Коласа — жывая вада для беларускай культуры. Для мяне Колас — творца, які прыйшоў яшчэ ў дзяцінстве з казкамі, у юнацтве — з душэўнымі пошукамі падчас чытання «Сымона-музыкі». У старэйшым узросце — гэта вершы пра вайну: Колас усім сэрцам любіў сваю зямлю і ў кожным радку яго глыбокі патрыятызм і любоў да Радзімы. А цяпер, калі я ўжо выкладчык, для мяне Колас — гэта філасофія...»

Падрыхтавала Марыя ЯРАШЭВІЧ
Фота Кастуся ДРОБАВА